# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Лепш папярэдзіць

# НЕДАСТАТКОВАЯ МАТЫВАВАНАСЦЬ ЖАНЧЫН?

Анколагі расказалі пра рак малочнай залозы

**Захваральнасць на рак грудзей у Мінску адна з самых высокіх у краіне. Прычым, кожны трэці выпадак — запушчаны. На 3—4 стадыях да ўрачоў звяртаецца 34—35 % жанчын. Пры гэтым лічбы па захваральнасці і смяротнасці ў Беларусі не адрозніваюцца ад агульнаеўрапейскіх. Ва ўсім свеце кастрычнік адзначаецца як месяц барацьбы супраць раку малочнай залозы. У Беларусі гэта адна з самых распаўсюджаных лакалізацый раку ў жанчын. Анколагі расказалі, хто ўваходзіць у групу рызыкі і як часта варта правярацца.**



### ПІК ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ — У 45—69 ГАДОЎ

Летась у Мінску на рак малочнай залозы захварэла 1134 жанчыны. Ужо сёлета такі дыягназ упершыню пастаўлены 817 мінчанкам.

— Адна з галоўных нашых задач — ранняя дыягностыка гэтага захворвання. Тут вельмі важна рана пачаць лячэнне, каб атрымаць станоўчы вынік. Аднак нягледзячы на ўсе нашы намаганні, працэнт запушчаных пухлін у Мінску высокі. На 3—4 стадыі захворванне выяўляецца ў 34—35 % выпадкаў, — расказвае **загадчык анкахірургічнага аддзялення № 1 Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Аляксандр ГЛАДЫШАЎ**. — Сярод найбольш неспрыяльных у 2018 годзе — Партызанскі і Першамайскі раёны, за дзевяць месяцаў гэтага года — Партызанскі і Фрунзенскі раёны, дзе рак на 3—4 стадыях выявілі адпаведна ў 31,4 % і 29 % пацыентак.

Пры гэтым спецыяліст адзначыў, што і абсталявання, і спецыялістаў для дыягностыкі ў нас дастаткова.

— Мамографы ўстаноўлены ва ўсіх цэнтральных паліклініках Мінска. Ёсць прамая тэлемедыцынская трансляцыя паміж 34-й гарадской паліклінікай, дзе праходзіць праграма скрынінгу раку малочнай залозы, і анкадыспансерам. Вопытных рэнтгенолагаў і рэнтгеналабарантаў хапае. Тут ролю адыгрывае недастатковая матываванасць саміх жанчын.

Анколаг растлумачыў, што рак выяўляецца пераважна на 3-й стадыі. З 34 % толькі 5 % — 4-я стадыя, усе астатнія — 3-я. Пры гэтым зусім нядаўна пачалі прымяняцца іншыя падыходы да класіфікацыі пухлін, у тым ліку і з гэтай прычыны колькасць раку на 3-й стадыі вырасла. Смяротнасць у нас ад гэтага захворвання складае (з улікам усіх стадый) 23 чалавекі на 100 тысяч насельніцтва — гэтыя лічбы на ўзроўні сярэднееўрапейскіх.

У Беларусі, як і ва ўсім свеце, павялічваецца колькасць раку малочнай залозы ў маладых жанчын.

— Пік захваральнасці — 45—69 гадоў. Раней выпадкі раку малочнай залозы ў маладых жанчын былі казуістычнымі. Сёння штогод у нашым дыспансеры праходзіць лячэнне да дзясятка пацыентак да 30 гадоў, — адзначае Аляксандр Гладышаў. — Павялічваецца колькасць раку, звязанага з цяжарнасцю. Штогод ёсць выпадкі, калі ён развіваецца на фоне цяжарнасці або адразу пасля родаў. Такія пухліны крайне агрэсіўна працякаюць і маюць дрэнны прагноз.

— Рак у маладых жанчын — сусветная тэндэнцыя, звязаная як з павелічэннем фактараў рызыкі, так і з паляпшэннем дыягностыкі. Раней мы не валодалі такімі дыягнастычнымі магчымасцямі, якія сёння дазваляюць выяўляць мікраскапічныя пухліны, з якімі дзесяцігоддзі таму жанчына працягвала жыць у няведанні, — дадае **загадчык лабараторыяй рэканструктыўна-аднаўленчай хірургіі і анкамамалогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Антон ХОРАЎ.**

Анколагі пацвярджаюць, што здараліся выпадкі, калі рак у пацыентак узнікаў на фоне стымуляцыі перад экстракарпаральным апладненнем, і жанчына памірала. Цяпер распрацаваны спецыяльныя падыходы, якія дазваляюць пазбегнуць развіцця пухлін. Аднак кансультацыя анколага перад такой працэдурай па-ранейшаму не лішняя.

### ХТО Ў ГРУПЕ РЫЗЫКІ?

Фактарамі рызыкі ўзнікнення раку грудзей спецыялісты называюць ускладнены сямейны анамнез (калі рак малочнай залозы ці органаў малога таза мела матуля, сястра ці бабуля), аборты, адсутнасць цяжарнасці, позняе спыненне менструацыі (пасля 55 гадоў), курэнне і ўжыванне алкаголю, працяглае ўжыванне гарманальных кантрацэптываў, траўмы малочнай залозы. Як правіла, рак развіваецца пры наяўнасці комплексу фактараў рызыкі. Раз на месяц рэкамендуецца праводзіць самаабследаванне: пальпаваць перад люстрам малочныя залозы.

— Самаабследаванне ніхто не адмяняў. Інфармацыя пра тое, як яно праводзіцца, маецца на стэндах ва ўсіх жаночых кансультацыях. Канешне, дробныя ўтварэнні ў міліметр жанчына не прапальпуе. Больш буйныя — у паўсантыметра-сантыметр — яна ў стане знайсці сама. Панікаваць не трэба, большасць наваўтварэнняў у грудзях дабраякасныя, але праверыцца ў спецыяліста варта, — адзначыў Антон Хораў.

### КАМУ ГЕНЕТЫЧНЫ АНАЛІЗ?

Калі рак грудзей быў у матулі ці бабулі, жанчына ўваходзіць у групу рызыкі па спадчыннасці раку. У такім выпадку трэба пракансультавацца з анколагам па месцы жыхарства. Ён вырашыць, ці варта рабіць генетычны аналіз на носьбіцтва спадчыннага гена, які адказвае за развіццё раку малочнай залозы. Аналіз выконваецца ў малекулярна-генетычнай лабараторыі пры РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Забор матэрыялу праводзіцца і на базе гарадскога анкалагічнага дыспансера. Аднак мэтазгоднасць такога аналізу вызначае ўрач-анколаг.

— Паводле новых стандартаў, аналіз на носьбіцтва мутацый у генах BRSA1 і BRSA2 у пацыентак да 40 гадоў з ужо пацверджаным ракам малочнай залозы абавязковы. Пры станоўчым аналізе на мутацыі пацыенткам, якія ўжо захварэлі, выконваецца двухбаковая мастэктамія (выдаленне малочнай залозы): не толькі пашкоджанага пухлінай органа, але і здаровага — у прафілактычных мэтах. Бо рызыка, што пухліна з'явіцца і ў ім, вельмі высокая. Часам з гэтай прычыны мяняецца і схема хіміятэрапіі. Пасля выдалення рэканструкцыйная аперацыя з устаноўкай імплантаў робіцца бясплатна, — адзначае Аляксандр Гладышаў.

### МАМАГРАФІЯ ЦІ УГД?

Кожная жанчына ва ўзросце 50—69 павінна праходзіць мамаграфію. Калі ёсць паказанні, працэдура прызначаецца і раней. Больш маладым жанчынам паказана УГД малочных залоз. Яго пажадана праходзіць штогод, асабліва пацыенткам, якія маюць мастапатыю.

Праект па скрынінгу раку малочнай залозы ў групах рызыкі ў Мінску рэалізуецца на базе 34-й паліклінікі. Базавыя ўстановы для скрынінгу раку малочнай залозы ёсць ва ўсіх рэгіёнах.

— Асноўная праблема — нізкая матывацыя жанчын. Нягледзячы на тое, што сёння шмат інфармацыі, кожнай жанчыне з мэтавай групы мы дасылаем ліст, дзе падрабязна расказваем, што такое мамаграфія, і запрашаем прайсці. Многія адмаўляюцца: баяцца атрымаць дыягназ і не ведаюць, што будзе з імі далей. Але ні адна жанчына ў нас не будзе пакінута сам-насам з хваробай, — кажа **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце 34-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Савецкага раёна Мінска Вадзім КАСЦЮКОЎ.** — Паводле даных, самая высокая захваральнасць на рак грудзей у 50—69 гадоў. Стараемся ахапіць гэту катэгорыю.

Калі ў пачатку праекта мамаграфію праходзіла 20—25 % жанчын з мэтавай групы, то сёлета іх ужо 60 %. Аптымальным варыянтам будзе ахоп у 70 %, менавіта такую лічбу рэкамендуе Сусветная арганізацыя аховы здароўя.

Сумны рэйтынг

# БЕЗ СТРАТЫ ПРЫТОМНАСЦІ І ЭКАНАМІЧНАГА ЭФЕКТУ

## Ці ёсць бяспечная доза алкаголю?

**Беларусь па-ранейшаму ўваходзіць у 30-ку краін свету з самым высокім ужываннем алкаголю. Згодна з данымі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на кожнага беларуса, старэйшага за 15 гадоў, прыходзіцца 11,2 літра спірту ў год. Гэта 27-ы паказчык у свеце. Пры гэтым паводле нацыянальнага даследавання Steps, кожны трэці беларускі мужчына ўжывае алкаголь па найбольш небяспечнай мадэлі — шэсць і больш чарак за дзень.**



Пры гэтым у Расіі, дзякуючы строгім мерам кантролю над алкагольнай прадукцыяй, ужыванне спіртнога з 2003 года знізілася больш чым на 40 %. А чаканая працягласць жыцця істотна павялічылася.

Паводле слоў **каардынатара праграм па грамадскім здароўі краінавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Валянціна РУСОВІЧА**, смяротнасць ад усіх прычын у Расіі скарацілася з 2003 да 2018 года на 39 % у мужчын і на 36 % у жанчын. Пры гэтым найбольш заўважныя змены дэманструе статыстыка смерцяў, звязаных з ужываннем алкаголю — выпадковыя атручэнні, самагубствы, ДТЗ і іншыя. Адлюстраваннем гэтай тэндэнцыі стала павелічэнне чаканай працягласці жыцця: у 2018 годзе яна дасягнула ў Расіі гістарычнага максімуму: 68 гадоў у мужчын і 78 гадоў у жанчын.

Чаканая працягласць жыцця ў Беларусі на адзін год большая як у мужчын, так і ў жанчын. І ўжыванне алкаголю ў нас таксама крыху зніжаецца. Тым не менш медыкі ўпэўнены, што рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па скарачэнні шкоднага ўжывання алкаголю, якія выконвае Расія, былі б карысныя і для Беларусі.

— Існуе некалькі памылковых поглядаў на ўзмацненне жорсткасці мер кантролю над алкагольнай прадукцыяй. Але вопыт Расіі іх абвяргае. У 2014 годзе ў Расіі акцыз на гарэлку быў павялічаны на 25 %, адпаведна адбылося зніжэнне продажаў на 25 %. Але паступленні ў бюджэт за кошт больш высокага акцызу павялічыліся на 7 %, — аргументуе Валянцін Русовіч.

### З мінімальнай рызыкай — адзін-два бакалы

На дыспансерным уліку ў нарколагаў у Беларусі стаіць каля 156 тысяч чалавек, якія маюць алкагольную залежнасць. За восем месяцаў гэтага года, паводле інфармацыі **загадчыка Рэспубліканскага цэнтра наркалагічнага маніторынгу і прэвенталогіі РНПЦ псіхічнага здароўя Аляксея КРАЛЬКО**, іх колькасць скарацілася на 6 %. Але кожны трэці мужчына ў Беларусі або мае алкагольную залежнасць, або ўжывае алкаголь па шкоднай мадэлі.

— Для мужчын гэта 6 і больш адзінак за раз, для жанчын — 4 і больш. Стандартная адзінка — гэта бакал ці чарка, якая ўтрымлівае 10 грамаў чыстага алкаголю, — тлумачыць Валянцін Русовіч.

Спецыялісты падкрэсліваюць, што бяспечнага ўзроўню алкаголю не існуе — у ідэале чалавек не павінен піць спіртное ўвогуле. А тым, хто ўсё ж ужывае, каб пазбегнуць шкоднага ўплыву, варта прытрымлівацца парогавых значэнняў.

— Ужыванне алкаголю з мінімальнай рызыкай — гэта да дзвюх стандартных адзінак у дзень для мужчын, і да адной — для жанчын. Пры гэтым мінімум два дні запар у тыдзень чалавек павінен цалкам адмовіцца ад алкаголю. Адна адзінка — гэта да 35 мілілітраў моцнага спіртнога, 0,33 літра піва ці 110—120 мілілітраў віна. Для жанчын гэта адзін бакал віна ў дзень, для мужчыны — два. Шкодны ўплыў пачынаецца з шасці стандартных адзінак для мужчын і чатырох — для жанчын. Прасцей кажучы, шосты тост для мужчын і чацвёрты тост для жанчын — гэта ўжо шкоднае ўжыванне і небяспека інтаксікацыі, — падкрэслівае Валянцін Русовіч.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Падпіска-2019

# ХТО ПАЕДЗЕ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ?

**Што толькі не разыгрывала «Звязда» сярод сваіх падпісчыкаў! Той, хто ўважліва чытае газету, ведае, што сярод прызоў былі і парачкі парсючкоў, і халадзільнікі, і шпалеры, і люстры, і тэлевізары, і трымеры, і мабільнікі... Рэчы — заўважце — вельмі патрэбныя, і набываліся яны загадзя. Як, дарэчы, і фітнес-трэкеры ды ровар, лёс якіх вырашаўся днямі.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Такім чынам, інтрыгі не засталося: усе карткі-купоны, дасланыя ў рэдакцыю падпісчыкамі газеты на чацвёрты квартал альбо другое паўгоддзе гэтага года, «прайшлі» праз наш чароўны капялюш. А шчаслівыя сярод іх — навобмацак, усляпую — па традыцыі «выбіралі» шаноўныя госці: **арганізатар рознічных продажаў Белсаюздруку Наталля ТАЛСТЫКА, а таксама неаднаразовыя пераможцы звяздоўскіх конкурсаў на найлепшы подпіс да здымка і найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю Любоў ЧЫГРЫНАВА і Іван АСТРОЎСКІ** (зніміце капялюш, як той казаў: у свае 80 ён чытае лекцыі студэнтам універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, у тым ліку — на англійскай мове... На беларускай, дарэчы, мог бы таксама...).

Хто з іх падачы стаў шчаслівчыкам?

### Фітнес-трэкер D&A M2 выйгралі:

**Лайтар Сяргей Мікалаевіч,** *вёска Міжлессе Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці;*

**Страшынская Ірына Міхайлаўна,** *вёска Пліса Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці;*

**Раманенка Яўген Валер'евіч,** *горад Светлагорск Гомельскай вобласці;*

**Іваноў Мікалай Мікалаевіч,** *вёска Зелянец Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці;*

**Марус Надзея Савельеўна,** *горад Глуск Магілёўскай вобласці;*

**Азарка Марыя Васілеўна,** *горад Нясвіж Мінскай вобласці;*

**Рыбінскі Станіслаў Васілевіч,** *горад Мінск.*

### Суперпрыз — ровар Mikado Blitz Lite — выйграла:

**Кавалёва Іна Віктараўна,** *горад Гомель.*

Віншуем!

Што сказаць тым, каго ўдача гэтым разам (альбо зноў) абмінула? Ды, відаць, заўсёднае: не варта засмучацца. Вы не выйгралі, але ж, спадзяёмся, і не прайгралі: у любым выпадку да вас пяць разоў на тыдзень будзе прыходзіць родная газета на роднай мове — каб інфармаваць, прасвятляць, дапамагаць парадамі, каб часам забаўляць і... зноў дарыць надзею, пра якую, дарэчы (клопатам **спадара Івана Астроўскага**), можна не толькі прозай:

*Шкода грошай, ды але —*
*Быў жа ровар на стале!*
*І таму я зноў пайду*
*Падпісацца на «Звязду».*
*Можа, шчасце не міне —*
*Будзе нешта і ў мяне!*

Гэта — заўважце — ён не толькі пра сябе, але і пра вас: бо павінна ж быць!

Праўда, толькі марыць аб гэтым мала...

Адзін мужчынка, расказвалі, дужа хацеў выйграць звяздоўскі суперпрыз... Штовечар прасіў: «Божа, дапамажы...» І ўрэшце... стаміўся Бог яго слухаць. Сказаў: «Чалавеча, дапамажы і ты мне: падпішыся на гэту газету, дашлі картку на розыгрыш!» І тады...

Рэдакцыя зноў выбірае прызы. Якія? Пакуль сакрэт.

**АФІЦЫЙНА**

**Арганізатарам рэкламнай гульні «Жывіце Здорава са «Звяздой»!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013.**

**Рэкламная гульня «Жывіце Здорава са «Звяздой»!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 27.08.2019 (пасведчанне № 3626) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 6 верасня да 31 снежня 2019 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2019 года.**

**Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 132 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.**

**Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.**

Лініі жыцця

# «ТВОЙ СЫН ПАПРАВІЦЦА»,

## або Аб тым, як стаць шчаслівым

**Свет памяняўся, і пра шчасце, кажуць, лепш не ўспамінаць. Маўляў, не да яго цяпер, — трэба думаць, як узбіцца на грошы, зрабіць кар'еру, набыць прэстыжнае жыллё, машыну, але...**
**Надыходзіць старасць, і чалавек пачынае разумець, што жыццё не мае сэнсу без шчасця, а яно, як правіла, у дзецях, якія помняць і любяць.**

Мая знаёмая цётка Вольга часцяком хадзіла на вячоркі ў шматдзетную сям'ю цёткі Таццяны. Тая вельмі бедна жыла, грошай век не хапала, таму яе дзеці аж да халадоў бегалі то босыя, то голыя, рады былі кавалачку сала...

І ў інстытуты пасля школы яны не пайшлі, сталі працаваць хто прадаўцом, хто швачкай, хто шафёрам... Затое Вольга хвалілася, што яе адзіны сынок адвучыўся сам, а цяпер вучыць іншых студэнтаў, што ў яго вялікая кватэра ў Мінску і ён не жыве, а як сыр у масле плавае.

Цётка Таццяна ад душы падддаквала, бо Паўлік і сапраўды ж велічыня: выбіўся ў людзі, зрабіў кар'еру, ды яшчэ, казалі, і свой бізнес адкрыў. Які, цётку Вольгу ніхто не распытваў, аднак паважалі ўсе, а заадно і дапамагалі: прывезці і накалоць дроў, абкасіць падворак, выпісаць курам збожжа... Сыну ж не да таго. Маці расказвала пра ўсё новыя яго дасягненні, вышывала яму прыгожыя ручнікі ды абрусы, зрэдку ездзіла ў сталіцу, аднак вярталася адтуль вельмі хутка — на наступны ж дзень. Жанкі часам пыталіся, чаму не засталася, не пагасціла ў сына. Цётка з форсам адказвала, што Паўліку не да вясковых размоў, — яму трэба рыхтавацца да чарговых сімпозіумаў...

У вёску Паўлік таксама зрэдку прыязджаў, але ж ні яго, ні жонку ніхто і ніколі не бачыў у вясковай краме, у гародзе, на сенакосе: каля дома акруцяцца, у машыну пасядуць ды паехалі. А маці, бы тая птушка, потым яшчэ месяц-другі шчабеча, які ж яе Паўлік харошы!

Так праляталі дні і гады, аж пакуль матуля не захварэла: доўга ляжала ў бальніцы, потым дома. Людзі не разумелі, дзе ж той хвалёны сын, чаму не едзе да маці, чаму не забярэ яе да сябе, як робяць многія дзеці... Аднак пытаць пра гэта ў хворай ніхто не пасмеў — проста дапамагалі хто як мог.

Час ішоў, жанчыне па-ранейшаму нездаровілася, а Паўліка ўсё не было. І нарэшце паштальёнка, якая прыносіла цётцы пенсію, не вытрымала: заўважыла нумар тэлефона (паперка з ім ляжала каля апарата) і пазваніла сыну — сказала, што маці зусім нядужая.

А ў адказ пачула, што ў яго таксама здароўя ўжо няма і ў такую далеч ён «не наездзіцца»...

Паштальёнка, уражаная гэтым «інтэлігентным» раўнадушшам, цётцы пра яго нічога не сказала. Аднак сын у вёсцы ўсё ж з'явіўся. Суседзі чулі, што крычаў, даводзіў маці, што стаміўся слухаць яе скаргі на здароўе, што не будзе забіраць яе да сябе, бо да яго прыходзяць важныя людзі, а яна сваімі манерамі будзе іх толькі пужаць... І ўрэшце, што не трэба ганьбіць яго перад людзьмі — даймаць рознымі «падстаўнымі» званкамі...

Пасля таго як Паўлік з'ехаў, цётка некалькі дзён зусім не вылазіла з дому, але ж тым, хто заходзіў да яе, казала, што сын пакінуў ёй грошай, навёз прысмакаў... Між тым на табурэце ля ложка — людзі бачылі — стаялі толькі кубак з кіпнем ды слоік з варэннем, ляжаў кавалачак хлеба...

Хутка цётцы Вользе прызначылі сацыяльнага работніка. За гэтую работу ўзяўся яе сусед: прыносіў прадукты, прапальваў у грубцы, прыбіраў у хаце... Але ж мужчынскі догляд разумееце, які: падапечная іншы раз хадзіла нямытая, у брудным адзенні і абутку, што, праўда, не перашкаджала ёй па звычцы выхваляцца сынам ды казаць, што не прыязджае ён толькі таму, што таксама нездаровы — сэрца...

Тым часам у хаце яе сяброўкі Таццяны па-ранейшаму віравала жыццё: пастаянна прыходзілі і прыязджалі дочкі, сыны, зяці, нявесткі, унукі, унучкі. А калі бабуля занядужала, дзеці забралі яе да сябе...

Сустрэліся жанчыны гады праз чатыры на дзень Перамогі. Таццяне, слабенькай, але дагледжанай, у прыгожай квяцістай хустцы і касцюме, дзеці дапамаглі выйсці з машыны, каб правесці — пасадзіць сярод іншых удоў ветэранаў вайны, як яна раптам спынілася.

— Вольга, ты? — спытала з болем, не пазнаючы сваю былую сяброўку. Тая згодна заківала галавой, заплакала:

— У Паўліка майго хворае сэрца, — сказала Таццяне.

Тая, як і раней, стала суцяшаць:

— Не адчайвайся... Твой сын паправіцца... Вось убачыш!

Таццяна нешта шапнула сыну, той падбег да машыны — вярнуўся з пакетам і працягнуў яго Вользе. Тая паглядзела на атрыманыя гасцінцы, на мужчыну, кінулася дзякаваць і спяшацца дадому — той прапанаваў падвезці.

У хуткім часе пасля мітынгу цётка Вольга, казалі, злягла і болей ужо не ўстала.

**Валянціна Бобрык,**
*г. Івацэвічы.*

Чалавек — чалавеку

# Адзін дзень з жыцця вяскоўцаў

**Кацярына з Рыгорам — пенсіянеры і нават з вялікім стажам: не тыя гады, не тыя ўжо і сілы, але ж па прывычцы трымаюць вялікую гаспадарку. І кароўка ў іх ёсць, і ладны бычок, і свінні, і куры, нават пчальніком гаспадар абзавёўся. Праўда, вопыту ў гэтай справе пакуль малавата. У той дзень вылецеў рой, а што з ім рабіць?**

Пакуль гаспадар дапяў, пчолы як не з'елі — твар апух, замест вачэй толькі вузкія шчылінкі: ні даць ні ўзяць — японец. Але ж з-за гэтага работу не кінеш.

З поля, дзе яны з жонкай у гарачыню палолі капусту, прыехалі надвячоркам, а ўжо ж і мурзатыя... Гледзячы адно на аднаго, яшчэ пасмяяліся ды прыводзіць сябе ў парадак часу не мелі — трэба было пыніць гаспадарку. Работу яны ніколі не дзялілі на тваю і маю. Адзінае — па бычка звычайна хадзіў гаспадар. А тут пайшла гаспадыня. І той, шаленец, ці не пакрыўдзіўся: не хоча ісці дадому ну хоць ты плач! Кацярына з ім і гэтак, і так, а ўрэшце, бедная, ўблыталася ў ланцуг, павалілася — зламала руку.

Трэба ехаць у бальніцу. А як — у гэтакім выглядзе? І з кім: у самой — рука, у мужа — твар... Яшчэ падумаюць, што бамжы...

Прыйшлося пазваніць дзецям — паклікаць на выручку.

Сын, адчыніўшы дзверы ды ўбачыўшы бацькоў, аж аслупянеў. Відаць было, што хацеў засмяяцца, але ж пабаяўся пакрыўдзіць. Дапамог матулі памыцца, адвёз у бальніцу.

Дзякуй богу, усё абышлося: бычка здалі на мяса, з пчоламі падружыліся (мёд носяць спраўна і болей не кусаюць), косці з цягам часу зрасліся...

Так што зноў кіпіць і віруе жыццё ў іх на падворку, у вёсцы. Часу няма сумаваць.

Не верыце? Прыязджайце! А вось ды спадабаецца?

**Галіна Нечыпаровіч,**
*Уздзенскі раён.*

Спявай, душа!

### «ПАКАХАЛА Я ХЛАПЧЫНУ, АКАЗАЛАСЯ — ПРАРАБ...»

Ах, каханне ты, каханне,
Спаць начамі не дае:
Каго любіш, той не гляне,
А не любіш — прыстае.

* * *

Я не бачыла каханка
Тры дзянёчкі, тры начы.
Дзе ж ты дзеўся, любы Янка?
Мо надумаў уцячы?

* * *

Розных крам цяпер лавіна,
Ды адно запомні ты:
Зойдзеш толькі на хвіліну —
Кашалёк ужо пусты.

* * *

Дзве сарокі на страсе
Між сабой спрачаюцца...
Палюбіце хто мяне —
Маладосць канчаецца!

* * *

Пакахала я хлапчыну,
Аказалася — прараб!
Яму дзеўкі не па чыну,
У яго брыгада баб.

* * *

Маразы да нас ідуць:
Як тут не маркоціцца.
Усе дзеўкі шлюб бяруць,
І мне замуж хочацца.

**Галіна Пятроўская,**
*Смаргонскі раён.*

Усмешачку!

Гора, гора ў Мішачкі:
Еў учора вішанькі,
І з адной праскочыла
Кругленькая костачка.
Улеглася ў жываце...
А як возьме й прарасце?
Як аднойчы на галоўцы
У малога зацвіце?
...Плача Міша —
не суняць:
Як жа костачку дастаць?

**Зоя Навоенка,**
*г. п. Падсвілле, Пастаўскі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**